## Тэма ўрока: Контррэфармацыя ў Беларусі

**Мэта ўрока:** стварыць умовы для фарміравання ў вучняў ведаў аб прычынах, сутнасці і выніках контррэфармацыі, а таксама аб формах барацьбы, якія выкарыстала каталіцкая царква ў супрацьстаянні з рэфармацыйным рухам. Садзейнічаць пашырэнню ведаў вучняў пра асаблівасці контррэфармацыі ў Вялікім княстве Літоўскім.

**Задачы урока:**

**Навучальныя:** вызначыць сутнасць контррэфармацыі; ахарактарызаваць формы барацьбы каталіцкай царквы з Рэфармацыяй і дзейнасць каталіцкіх манаскіх ордэнаў на тэрыторыі Беларусі; выявіць асаблівасці і вынікі контррэфармацыі ў Вялікім княстве Літоўскім.

**Развіваючыя:** спрыяць развіццю ўменняў характарызаваць гістарычныя з'явы, аналізаваць гістарычныя факты, раскрываць прычынна-выніковыя сувязі, рабіць высновы.

**Выхаваўчыя:** садзейнічаць выхаванню рэлігійнай талерантнасці вучняў.

**Тып урока:** камбінаваны

**Асноўныя паняцці:** контррэфармацыя, езуіты, калегіум, клерыкалізацыя

**Асноўныя персаналіі:** Валяр'ян Пратасевіч, Мікалай Крыштаф Радзівіл (Сіротка)

**Абсталяванне:** Гісторыя Беларусі: другая палова XVI - канец XVIII ст .: вучэбны дапаможнік для 8-га кл. агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання / В.А.Белазаровіч, І.П.Крэнь, М.М. Ганушчанка. - Мн., 2010; раздатачны матэрыял (карткі з тэставымі заданнямі, табліца).

### План урока

**І. Арганізацыйны этап.** Настаўнік вітае вучняў, стварае працоўную атмасферу, наладжвае кантакт з аўдыторыяй, паведамляе інфармацыю аб тэме і ходзе ўрока.

**ІІ. Праверка хатняга задання (§ 8).** Праверка можа ажыццяўляцца ў пісьмовай форме. Прапануецца адзін з варыянтаў пісьмовай працы.

**Тэст**

**1.Рэфармацыйны рух пачаўся з:**

а) Германіі
в) Вялікабрытаніі
б) Францыі
г) Расіі

**2.Ідэі кальвінізму атрымалі найбольшае распаўсюджванее:**

а) сярод магнатаў і шляхты
б) сярод мяшчан
в) сярод сялян

**3.Як называлася кніга, якую надрукаваў С. Будны ў Нясвіжы ў 1562 г.:**

а) "Песня пра зубра"
в) "Катэхізіс"
б) "Малая падарожная кніжка"
г)"Евангелле"

**4.Хто з'яўляўся лідарам кальвінізма ў ВКЛ:**

а) М. Радзівіл Чорны
б) С. Будны
в) В. Цяпінскі

**5.Суаднясіце тэрміны і азначэнні:**

а) рэфармацыя
б) кальвінізм
в) арыянства
г) парафія
д) "евангелікі"

1.накірунак пратэстантызму, прадстаўнікі якога лічылі Біблію асноўнай крыніцай веры
2.грамадска-палітычны рух накіраваны на рэфармаванне каталіцкай царквы
3.каталіцкі прыход
4.феадалы-пратэстанты ў ВКЛ
5.накірунак пратэстантызму, прадстаўнікі якога адмаўлялі дагмат царквы аб трыадзінстве божым

**6.Суаднясіце даты і падзеі:**

а) 1517 г.
б) 1557 г.
в) 1563 г
г) 1573 г.

1. прівілей Жігімонта ІІ Аўгуста аб ураўнанні ў правах шляхты рознага веравызнання
2. акт аб свабодзе веравызнання
3. заснаваны Віленскі сбор
4. выступленне М. Лютера з 95 тэзісамі

**7.Устаўце прапушчанае:**

Першая кальвініcцкая абшчына ўзнікла каля … г. у горадзе …
Усяго ў ВКЛ налічвалася … гельвецкіх і каля … арыянскіх абшчын.

**8.Што аб'ядноўвае гэтых гістарычных асоб?**

Библиотека БГУИР

М. Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі
**9.Складзіце пералік:**
Да ліку магнатаў, якія далучыліся да рэфармацыі адносяцца прадстаўнікі наступных магнацкіх родаў …
Прадстаўнікамі сялянскага накірунку ў арыянстве з'яўляюцца …
**10.Закончыце сказ:**
Асноўнымі прычынамі распаўсюджвання рэфармацыі ў ВКЛ з'яуляюцца …
Распаўсюджванне рэфармацыі ў ВКЛ прывяло да …

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап.** Пастаноўка задач вучэбнай дзейнасці. Настаўнік знаёміць вучняў з планам работы. У ходзе абмеркавання ажыццяўляецца фармуляванне мэты і задач урока. **План вывучэння новага матэрыялу:**
1. Контррэфармацыя
2. Дзейнасць езуітаў
3. Вынікі контррэфармацыі

**Вывучэнне новага матэрыялу**

**1. Контррэфармацыя**

Вучням прапануюцца пытанні, накіраваныя на актуалізацыю раней вывучанага матэрыялу з курсу сусветнай гісторыі: 1. Што такое контррэфармацыя? З якімі прычынамі было звязана яе ўзнікненне? 2. Каго называлі еретыкамі? 3. Хто і з якой мэтай стварыў «Таварыства Ісуса»? Дзе дзейнічала гэтая арганізацыя?

Такім чынам, **контррэфармацыя** - гэта рэлігійна-палітычны рух, накіраваны супраць рэфармацыі. Перад вучнямі ставіцца праблемнае заданне, да абмеркавання якога неабходна будзе звярнуцца на пры канцы ўрока: Параўнайце контррэфармацыю ў краінах Заходняй Еўропы і ў Вялікім княстве Літоўскім, пакажыце падабенства і адрозненні. Растлумачце, чаму на беларускіх землях контррэфармацыя не набыла такіх агідных форм, як у еўрапейскіх краінах.

Акцэнтуецца ўвага вучняў на тым, што падчас вывучэння новага матэрыялу будзе ажыццяўляцца складанне і запаўненне логіка-сэнсавай мадэлі. Настаўнік дае тлумачэнне па яе пабудове і сістэме каардынатаў (колу пытанняў): каардыната № 1 – Формы барацьбы з Рэфармацыяй; каардыната № 2 – Каталіцкія манаскія ордэны, якія дзейнічалі ў Беларусі; каардыната № 3 – Асаблівасці контррэфармацыі ў Вялікім княстве Літоўскім; каардыната № 4 – Вынікі контррэфармацыі.

Каталіцкая царква вяла жорсткую барацьбу з пратэстантызмам. Важную ролю ў гэтым адыграў Трыдэнцкі Сабор (1545-1563 гг.), на якім разглядаліся пытанні веравучэння і дысцыпліны. У працы сабора ўзялі ўдзел каталіцкае духавенства і прадстаўнікі ордэна езуітаў. Трыдэнцкі Сабор адхіліў магчымасць кампрамісу з пратэстантамі і выпрацаваў наступныя рашэнні: непахіснасць царкоўнай іерархіі, імшы і споведзі, пакланенне абразам, пацверджанне пасрэдніцкай ролі царквы і вярхоўнай улады Папы ўнутры яе, захаванне латыні як царкоўна-богаслужэбнай мовы, развіццё місіянерскай дзейнасці.

Заданне: Вызначце, якія формы барацьбы супраць распрстранення рэфармацыі выкарыстала каталіцкая царква. Вучні вывучаюць п. 1 Дзейнасць езуітаў (старонкі 52-53) і сумесна з настаўнікам запаўняюць апорныя вузлы каардынаты № 1.

**Формы барацьбы з Рэфармацыяй:**
• Дзейнасць царкоўнага суда
• Забарона і знішчэнне пратэстанцкай літаратуры
• Фізічнае знішчэнне пратэстантаў
• Пропаведзі, спрэчкі-дыспуты
• Стварэнне і дзейнасць манаскіх ордэнаў
• Дабрачыннасць
• Стварэнне навучальных устаноў (калегіумы)

**2. Дзейнасць езуітаў**

У барацьбе з распаўсюджваннем рэфармацыі важную ролю адыгралі каталіцкія манаскія ордэны. Некаторыя з іх дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі. Вучням прапануецца папрацаваць з раздатачным матэрыялам, вывучыць табліцу "Каталіцкія манаскія ордэны, якія дзейнічалі ў Беларусі" (праца ў парах) і запоўніць апорныя вузлы каардынаты № 2.

Библиотека БГУИР

**Каталіцкія манаскія ордэны, якія дзейнічалі ў Беларусі**

| Ордэн | Год стварэння | Сферы дзейнасці |
|---|---|---|
| **ЕЗУІТЫ** | 1540 г., Ігнацій Лайола | Мэтаю стварэння Ордэна езуітаў была барацьба з Рэфармацыяй і ерасямі, распаўсюджванне веры Хрыстовай. Адным з асноўных спосабаў дасягнення сваіх мэтаў Ордэн лічыў выхаванне моладзі ў духу набожнасці і веры праз сетку калегіумаў і акадэмій. Езуіцкія школы былі аднымі з найлепшых у Еўропе. Езуіты першымі падзялілі ўсю масу навучэнцаў на класы і распрацавалі праграмы паслядоўнага вывучэння прадметаў. Яны стварылі школьныя будынкі, увялі абсталяванне навучальнымі дапаможнікамі, умела чаргавалі заняткі з адпачынкам. На тэрыторыі Беларусі езуіты з'явіліся ў Вільні ў 1569 г. Да сярэдзіны XVII ст. яны стварылі на тэрыторыі ВКЛ шырокую сетку навучальных устаноў. Езуіцкія калегіўмы дзейнічалі ў Полацку, Оршы, Нясвіжы, Пінску, Гродне і інш. |
| **ФРАНЦЫСКАНЦЫ** | 1208 г., Францыск Азізскі | Члены ордэна прытрымліваліся і прапаведвалі рэлігійны аскетызм. Яны змагаліся з ерэтычным рухам пропаведзямі і насіллем. Першапачаткова з’явіліся ў Польшчы, адтуль пачалі місіянерскую дзейнасць у ВКЛ. Кляштары францысканцаў існавалі ў Гальшанах, Гродне, Драгічыне, Ашмянах, Мінску. Навагрудку і інш. |
| **ДАМІНІКАНЦЫ** | 1208 г., Дмінік дэ Гусман | Ордэн ажыццяўляў прапагандысцка-місіянерскую дзейнасць, веў барацьбу з ерасямі, узначальваў інквізіцыю. Герб ордэна ўяўляў выяву сабакі, якая нясе паходню. На Беларусі дамініканцы з’явіліся ў пачатку XVI ст. Іх кляштары былі ў Ашмянах, Віцебску, Гродне, Навагрудку, Нясвіжы, Оршы, Полацку, Слоніме і інш. Акрамя таго меліся рэзідэнцыі, бібліятэкі, навучальныя установы. |
| **КАРМЕЛІТЫ** | 1154 г., Бертольд Калабрыйскі | Ордэн быў заснаваны ў час крыжацкіх паходаў у Палесціне на гары Кармель (адсюль назва). Статут кармелітаў вельмі строгі, надае вялікае значэнне аскезе. Манастыры і касцелы кармелітаў дзейнічалі ў Бялынічах, Гродна, Лідзе. |
| **БЕНЕДЫКТЫНЦЫ** | 530 г., Бенядзікт Нурсійскі | Статут патрабаваў ад бенедыктынцаў сталага жыхарства ў кляштары, паслушэнства, устрымання і беднасці. На Беларусі бенедыктынцы мелі мужчынскія і жаночыя кляштары ў Мінску, Нясвіжы, Оршы, Нясвіжу. Пры кляштарах меліся школы, бібліятэкі, скрыпторыі. |
| **ПІЯРЫ** | 1597 г., Іосіф Каласанц | Каталіцкі манаскі ордэн, які займаўся навучаннем і выхаваннем моладзі праз сетку сваіх навучальных ўстаноў. У Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім з’явіліся ў 1642 г., мелі тут свае школы. |

**Каталіцкія манаскія ордэны, якія дзейнічалі ў Беларусі**

- езуіты (В. Пратасевіч)
- францысканцы
- дамініканцы
- кармеліты
- бенедыктынцы
- піяры

Библиотека БГУИР

У Вялікім княстве Літоўскім контррэфармацыя мела свае асаблівасці. У чым яны заключаліся? Для таго, каб іх вызначыць і ахарактарызаваць вучням прапануецца вывучыць старонкі 53-54 падручніка. Пасля абмеркавання матэрыялу вучні запаўняюць апорныя вузлы каардынаты № 3.

**Асаблівасці контррэфармацыі ў Вялікім княстве Літоўскім**

• Контррэфармацыя была накіравана супраць як пратэстантаў, так і праваслаўных
• ВКЛ – плацдарм для распаўсюджвання каталіцтва на усход
• Падтрымку ордэну езуітаў аказвалі каралі Рэчы Паспалітай

**3. Вынікі контррэфармацыі**

Контррэфармацыя ў беларускіх землях мела поспех і рэфармацыйны рух пайшоў на спад. Каардыната № 4 запаўняецца пад час тлумачэння настаўніка.

**Вынікі контррэфармацыі**

• Ліквідавана рэлігійная верацярпімасць
• Прыпынена дзейнасць пратэстанцкіх збораў, друкарняў, школ
• Пераход магнатаў і шляхты з пратэстантызма ў каталіцтва
• Адказнасць за змену каталіцкага веравызнанняў (1668 г., 1764 г.)
• Клерыкалізацыя культуры

**ЛСМ “КОНТРРЭФАРМАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ”**




**IV. Замацаванне вывучанага**

Замацаванне вывучанага матэрыяла ажыцяўляецца трыма шляхамі. Па-першае, аналізуюцца мэты урока і вызначаецца ці былі яны дасягнуты. Па-другое, неабходна узгадаць праблемнае пытанне, якое было зададена вучням на пачатку вывучэння новай тэмы і абмеркаваць. Па-трэцяе, можа быць прапанавана такая форма праверкі ведаў, як медыя-азбука.

| Літара алфавіта | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| А | Прадстаўнікі гэтага накірунку рэфармацыі ў 1658 г. былі выгнаны за межы дзяржавы | Арыяне |
| Б | Адзін са старэйшых манаскіх ордэнаў (заснаваны ў 530 г.) Манахі, якія належалі да яго, жылі ў кляштарах у устрыманні і беднасці | Бенедыктынцы |
| В | Віленскі біскуп, які ў 1569 г. запрасіў у ВКЛ 13 езуітаў | Валер’ян Пратасевіч |
| Д | Манахі гэтага ордэна займаліся прапагандысцка-місіянерскай дзейнасцю, вялі барацьбу з ерасямі, узначальвалі інквізіцыю. Герб ордэна ўяўляў выяву сабакі, якая нясе паходню | Дамініканцы |
| Е | Манаскі ордэн, які быў створаны для барацьбы з рэфармацыяй і ерасямі. Адным з асноўных спосабаў дасягнення сваіх мэтаў Ордэн лічыў выхаванне моладзі ў духу набожнасці і веры праз сетку калегіумаў і акадэмій. | Езуіты |

Библиотека БГУИР

| | | |
|---|---|---|
| Ж | Кароль Рэчы Паспалітай, які быў выхаваны ў духу адданасці каталіцтву, “езуіцкі кароль”. | Жыгімонт III Ваза |
| К | Навучальныя установы, якія дзейнічалі ў Вільні, Полоцку, Пінску і інш. гарадах ВКЛ | Калегіумы |
| Л | Заснавальнік ордэна езуітаў | Лайола Ігнацій |
| М | Абаронца праваслаў’я ў ВКЛ, аўтар кніг “Фрынас”, “Граматыка” | Мелецій Сматрыцкі |
| Н | Беларускі горад, які лічыўся галоўным іезуіцкім цэнтрам у ВКЛ | Нясвіж |
| П | Каталіцкі манаскі ордэн, які займаўся навучаннем і выхаваннем моладзі праз сетку сваіх навучальных ўстаноў. У Польшчы і ВКЛ з’явіўся ў 1642 г. | Піяры |
| Р | Грамадска-палітычны рух накіраваны на рэфармаванне каталіцкай царквы | Рэфармацыя |
| С | Кароль Рэчы Паспалітай, якому належаць словы: “Калі б я не быў каралем, быў бы езуітам” | Стэфан Баторый |
| Т | Царкоўны сабор, на якім разглядаліся пытанні веравучэння, дысцыпліны, узаімаадносін з пратэстантамі | Трыдэнцкі сабор |
| Ф | Члены гэтага ордэна прытрымліваліся рэлігійнАЙ аскеты, змагаліся з ерэтычным рухам пропаведзямі і насіллем | Францысканцы |

**VI. Рэфлексія**

Вучням прапануецца адказаць на наступныя пытанні і ацаніць сваю працу па 10 бальнай сістэме:

**Як я засвоіў матэрыял?**

- Атрымаў трывалыя веды, засвоіў увесь матэрыял – 9-10 балаў
- Засвоіў матэрыял часткова – 7-8 балаў
- Мала што зразумеў, неабходна яшчэ папрацаваць – 4-6 балаў
- Нічога не зразумеў, нічога новага не даведаўся –1-3 балы

**Як працаваў клас?**

- Дружна, сумесна разбіраў заданні – 8-10 балаў
- Не ўсе актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні – 5-7 балаў
- Праца была млявая, нецікавая – 1-4 балаў

**Дамашняе заданне:** § 9.

**Літаратура:**

Белазаровіч В.А. Гісторыя Беларусі ў 8 класе : вучэб.-метад. Дапам для настаўнікаў агульн. сярэд. адукацыі з беларус і рус. мовамі навучання / В.А. Белазаровіч. – Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2011. – 168 с.

Гісторыя Беларусі: Падручнік. У 2 ч. Ч.1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – 3-е выд. – Мінск, 2007.

Электронная энцыклапедыя “Вялікае княства Літоўскае” // Рэжым доступу : http://vklby.vh76.hosterby.com/

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.1–6. – Мн., 1991–2001.

Библиотека БГУИР